**УДК 821.161.3-311.6*Л.Дайнека**

***А. В. Канаваленка***

## АНЕЙРАСФЕРА І ЯЕ ФУНКЦЫІ Ў ГІСТАРЫЧНЫХ РАМАНАХ Л. ДАЙНЕКІ

*Артыкул прысвечаны разгляду ролі анейрасферы ў гістарычнай прозе Л. Дайнекі. У раманах пісьменніка сны і трызненні як мастацкі прыём арганізацыі прасторы твора пашыраюць традыцыйны спектр значэнняў, выконваючы псіхалагічную, прагнастычную, інфарматыўную, сюжэтабудаўнічую і міфатворчую функцыі, і спрыяюць данясенню скразной для творчасці Л. Данейкі ідэі – вернасці і адданасці роднаму краю.*

Анейрасфера з'яўляецца важным сэнсавым і структураўтваральным элементам многіх мастацкіх твораў. Па сваёй прыродзе сон уяўляе з сябе памежны феномен, што як своеасаблівая мастацкая рэчаіснасць мае свае ўнутраныя законы пабудовы, найбольш поўна і праўдзіва адлюстроўвае стан героя, дынаміку яго свядомасці; валодае ўнікальнымі тэмпаральнымі і прасторавымі характарыстыкамі. Галоўная асаблівасць анейрасферы ў тым, што яна, па словах Н. Нагорнай, "заўсёды застаецца сродкам, здольным вывесці персанажаў і чытача за рамкі адналінейнага апавядання; стварыць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

паралельную рэальнасць у тэксце і за яго межамі, а таксама ва ўяўленні” чалавека [1, с. 36]. На думку Ю. Лотмана, у мастацкай літаратуры можна вылучыць два тыпы анейрасферы: прадказальную і самаспазнавальную. “Сон адрозніваецца сваёй полілінгвіяльнасцю: ён апускае нас не ў зрокавыя, славесныя, музычныя ці іншыя прасторы, а ў іх злітнасць, аналагічную рэальнай. Гэта «нерэальная рэальнасць»” [2], – адзначае даследчык. Аднак пералічанымі функцыямі магчымасці сноў у мастацкім тэксце не абмяжоўваюцца.

У гістарычных раманах Л. Дайнекі “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака”, “Жалезныя жалуды”, “Назаві сына Канстанцінам” анейрасфера найперш дапамагае пісьменніку ўвасобіць ідэю вернасці роднаму краю. Менавіта ў снах, трызненнях і мроях герояў нярэдка гучыць голас памяці продкаў, што моцна ўздзейнічае на псіхалагічны стан дзеючых асоб і спрыяе прыняццю імі правільных лёсавызначальных рашэнняў. Блукаючы па свеце сноў, героі часта адчуваюць сорам, сум, роспач, а ў іх душах абуджаецца пачуццё адказнасці перад будучымі пакаленнямі за свае ўчынкі. Да прыкладу, Усяслаў Чарадзей (раман “След ваўкалака”) балюча ўспрымае словы старажытнага бога Перуна. У сне ідал называе князя і яго суайчыннікаў здраднікамі, якія забыліся на спрадвечную веру – паганства, замяніўшы яе чужой, хрысціянскай. Бог называе народ цьмяным і слабым, не здольным змагацца за сваю гісторыю і культуру: “Мне пакланяўся князь Рагвалод, усе твае прадзеды. <…> Чаму вас заўсёды вабіць тое, што не сваё? Беручы чужое, пакланяючыся чужому, вы самі прызнаяце перад усім светам, што вы цямнейшыя, слабейшыя розумам за іншых, дурнейшыя” [3, с. 136]. Але тым не менш, Пярун прызнае сваю паразу, бо ведае, што падобны лёс у рэшце рэшт чакае і хрысціянскага бога: “Хрысціянства <…> пераможа на нашай зямлі. <…> Але недаўгавечная гэта перамога. Надыдзе такі час <…>, калі людзі адмовяцца ад яго, будуць смяяцца з яго” [3, с. 136].

Акрамя гэтага, сон Усяслава Чарадзея ўказвае на дваістасць і супярэчлівасць унутранага стану героя, яго ваганні паміж язычніцтвам і хрысціянствам. Так, побач з вобразам ідала, якога князь абвінавачвае ў крыважэрнасці, паўстае магутная Сафія ў выглядзе жанчыны з вогненна-рыжымі валасамі. У дачыненні да яе князь спачатку адчувае страх. Сафія здзекуецца з паганскіх багоў, што былі пасечаныя на шматкі. Яе каменныя калені аж уздрыгваюцца ад смеху. Душу князя пачынае апякаць злосць: “Ты не смяяцца павінна, а плакаць. <…> Як ты плакала шмат стагоддзяў назад, калі першых хрысціян распіналі на крыжах” [3, с. 135]. Зыходзячы з адзначанага бачна, што сны герояў маюць псіхалагічную функцыю, дазваляюць пісьменніку раскрыць іх самыя патаемныя думкі і пачуцці. У анейрасферы вобразы персанажаў набываюць дадатковыя важныя рысы, становяцца больш шматграннымі і глыбокімі.

На карысць выказанага тэзіса гаворыць і сон Дабранегі (раман “Меч князя Вячкі”), які не толькі адлюстроўвае душэўныя трызненні княгіні, паглыбляючы псіхалагізм твора, але досыць выразна ўказвае на міфатворчую і прагнастычную функцыі анейрасферы. Першая праяўляецца праз выкарыстанне ўстойлівых сімвалічных форм, фальклорных вобразаў, схем, сюжэтаў і жыццёвых сцэнарыяў у снах. “Змест” анейрасферы ў такім выпадку складае ўсеагульны, архетыпічны матэрыял, што назапашваецца чалавекам на працягу некалькіх тысячагоддзяў. Пры гэтым ствараецца асабісты міф, які адлюстроўвае асноўныя пераломныя этапы ў жыцці героя. Так, Дабранезе мроілася, быццам бы да яе ў святліцу ўварваўся залатакрылы сокал. Схапіў ён перапужаную князёўну і памчаўся ў начное неба над пушчамі. А пасля “ўдарыўся белымі грудзьмі аб залатую хмару <…> і ператварыўся ў сінявокага высокага юнака незвычайнай прыгожосці” [4, с. 86]. Уплыў казачных матываў тут відавочны. Адметна і тое, што ў далейшым гэты сон спраўдзіцца ў рэальнасці: да князёўны завітаюць сваты, і Дабранега стане жонкай князя. Не менш красамоўны і сон Вячаслава, дзе князь імкнецца сарваць пяшчотны ліст з дрэва: “Захацелася князю сарваць гэты ліст, каб адчуць пальцамі клейкую ліпкасць зеляніны, але <…> чалавечым голасам закрычала старая ліпа: «Гэта мой сынок!»” [4, с. 266].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ліст, што крычыць як чалавек, яскрава адлюстроўвае народныя ўяўленні пра прыроду як адухоўленую істоту.

Нярэдка ў гістарычнай прозе пісьменніка рэалізуецца і інфарматыўная функцыя анейрасферы. Як вядома, сны ўяўляюць сабою сукупнасць звестак пачутага, убачанага і перажытага, што назапашваюцца ў падсвядомасці чалавека за суткі. Прыкладам можа паслужыць сон княжыча Далібора з рамана “Жалезныя жалуды”. Цяжка перажываючы страту сваёй каханай Рамуне, якую ўзялі ў палон браты Міндоўга, малады чалавек усімі сіламі імкнецца знайсці выхад з сітуацыі. Бясплённыя пакутлівыя спробы княжыча вярнуць каханую працягваюцца ў снах: “Так ні з чым вярнуўся Далібор да сваёй дружыны. Усю ноч яму снілася заплаканая Рамуне і быццам клікала некуды” [5, с. 104]. Прыём дублявання рэальных падзей уначных мроях толькі ўзмацняе драматычнае гучанне твора.

Яшчэ адной разнавіднасцю арганізацыі анейрасферы ў гістарычнай прозе Л. Дайнекі можна адзначыць так званы сон наяве, калі дзеянне ў рэальнасці сумяшчаецца з вобразамі падсвядомасці. Так, падчас ваенных дзеянняў змораны Вячка прытуліўся да забаролаў, невысокіх надбудоў над абарончымі сценамі замка, і заснуў. Мроілася яму незвычайная птушка, што пяшчотным голасам клікала воя: “Дзе ты мой князь?” [4, с. 296]. У рэальным свеце яе ролю выконвае жонка, што ласкава трасе Вячку за руку і паўтарае тыя ж самыя словы.

Трэба адзначыць, што прасторавая ўпарадкаванасць раманаў пісьменніка ўскладняецца не толькі снамі, але і трызненнямі, якія нярэдка маюць сюжэтабудаўнічую функцыю, уплываюць на ход развіцця далейшых падзей. У якасці выразнага прыкладу можна згадаць вобраз галаўніка Брацілы, што прыйшоў да сцен Кукейноса, каб забіць Вячку. Навязлівыя мроі мужчыны аб забойстве чалавека час ад часу перарываліся голасам маці, якая ўсімі сіламі спрабуе спыніць гнеў сына: “Што ты хочаш рабіць, сынок? – раптам нібы прагучаў у ягонай душы голас маці. <…> Не рабі чорную справу. Не пралівай кроў” [4, с. 16]. Словы блізкага чалавека на некаторае імгненне выбівалі галаўніка з каляіны, прымушалі яго спыніцца і задумацца. Аднак уплыў іншых людзей, а ў прыватнасці напарніка-тэўтона, не дазваляў Брацілу прыслухацца і змяніць свой жахлівы намер.

У сваю чаргу, іншы характар маюць размовы герояў у стане сну, што па сваёй прыродзе сумяшчаюць у сабе трызненні з матывам голасу продкаў. Так, семінарыст, які спаў побач з храністам Генрыхам, аднойчы сказаў яму: “Генрых, <…> ты размаўляеш нават у сне <…> не на латыні, не па-тэўтонску, і не па-свейску, а на нейкай дзіўнай незразумелай мове” [4, с. 208]. У адказ на гэта летапісец вельмі здзівіўся, а затым пачырванеў, нібы вараны рак. Аказалася, што лэцкія словы, якія Генрых чуў у дзяцінстве, моцна ўкараніліся ў свядомасці, і ад іх немагчыма было пазбавіцца. Яму стала вельмі сорамна за тое, што не “высакародныя ружы расцвітаюць у ягонай душы, а вострa колецца балотная асака мовы, якую ніхто ніколі не чуў” [4, с. 210]. Як бачна, Л. Дайнека чарговы раз указвае на адказнасць чалавека перад судом гісторыі, нашчадкамі і роднай культурай.

Такім чынам, анейрасфера ў гістарычных раманах Л. Данейкі “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака”, “Жалезныя жалуды”, “Назаві сына Канстанцінам” дастаткова зменлівая і поліфункцыянальная. Сны не толькі выкарыстоўваюцца з традыцыйнай для літаратуры мэтай паглыблення псіхалагізму і прадказання падзей, а маюць шырокі спектр значэнняў. Анейрасфера ў буйной прозе пісьменніка набывае міфатворчую, сюжэтабудаўнічую, інфарматыўную функцыі і спрыяе данясенню галоўнай ідэі яго гістарычных раманаў – вернасці і адданасці роднаму краю.

**Літаратура**

1 Нагорная, Н. А. Онейросфера в русской прозе XX века: модернизм, постмодернизм: дис. д-ра филол. наук: 10.01.01 / Н. А. Нагорная. – М. : МГУ им. М. В. Ломоносова, 2004. – 414 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 Лотман, Ю. М. Семиосфера [Электронный ресурс] / Ю. М. Лотман // Искусство- СПб. – Санкт-Петербург, 2000. – Режим доступа: http://yanko.lib.ru/books/cultur/lotman_ semiosphera.htm#_Toc17488764. – Дата доступа: 06.04.2017.

3 Дайнека, Л. След ваўкалака / Л. Дайнека. – Мінск : Юнацтва, 2001. – 348 с.

4 Дайнека, Л. Меч князя Вячкі / Л. Дайнека. – Мінск : Юнацтва, 1987. – 302 с.

5 Дайнека, Л. Жалезныя жалуды / Л. Дайнека. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 301 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ